Расьціслаў Лапіцкі нарадзіўся 1 верасня 1928 года ў вёсцы Касута на Вялейшчыне ў сям'і праваслаўнага сьвятара. У часе Другой сусьветнай вайны Лапіцкія апынуліся ў Кабыльніку на Мядзельшчыне. Тут у 1944 годзе Расьціслаў упершыню ўлучыўся ў патрыятычны рух, запачаткаваны на Віленшчыне навучэнцамі Віленскай беларускай гімназіі й духоўнай сэмінарыі. Пры арыштах падпольшчыкаў таксама быў зьняволены - за перадрук і распаўсюджанне ўлётак. Як малалетка, ён атрымаў тры гады турмы, старэйшы брат Алег - дзесяць.

Вярнуўшыся праз год па амністыі дахаты, юнак спачатку вучыўся ў Кабыльніку, а затым у Мядзельскай дзесяцігодцы. У Мядзеле Расьціслаў і разгарнуў працу па стварэнні новай нелегальнай арганізацыі. Актыўнымі яго памочнікамі сталі Факунда Несьцяровіч з Юшкавічаў і Язэп Качарга з Качарог. Сваю пазіцыю Лапіцкі выказваў з юначым максімалізмам: ***“Калі ведаеш, што ў гэтай хаце заначуе вораг Беларусі - спалі хату, калі хлеб з гэтай нівы пойдзе ворагу Беларусі - знішчы яе”***.

Увосень 1949 года аўдавелая маці перабралася з сынам да родзічаў у Смургоні. На новым месцы юнак ізноў пачаў шукаць тых, каму неабыякавы лёс Бацькаўшчыны. Назьбіралася паўтара дзесятка аднадумцаў. Лапіцкі - рослы, прыгожы, шчодра адораны прыроднымі задаткамі, з вострым розумам і палкім характарам - быў несумнеўным іх лідэрам. Пачалі з улётак. У вёсачцы над Вяллёй уладкавалі невялікую друкарню й неўзабаве ў горадзе, нават на будынках райкама й міліцыі, забялелі расклееныя праклімацыі, і кожная сканчвалася заклікам: **“Смерць Сталіну!”.**

Высачыць патрыётаў, не абазнаных у канспірацыі, было няцяжка. Дый сам Расьціслаў не хаваў сваіх перакананняў, асабліва на школьных уроках. Пад канец года яго арыштавалі. Тыднёвы допыт не вырваў прызнання, і юнак часова быў выпушчаны з вязьніцы. Паводле пастановы арганізацыі ён пакінуў Смургоні й таемна вярнуўся на Мядзельшчыну. Але й там цяжка было знайсьці надзейны прытулак, бо людзьмі апанаваў страх - мядзельскіх падпольшчыкаў ужо выдаў здраднік, і чуткі пра арышты шырока разышліся па раёне. У Кабыльніку зьнясілены й хворы Расціслаў ізноў быў схоплены эмгэбістамі. Гэтым жа часам ужо йшлі масавыя арышты й у Смургонях.

На допытах юнакоў і дзяўчат катавалі бязьлітасна. Хто вярнуўся жывым з канцлагераў, потым сьведчыў блізкім, што іголкі пад пазногці было не самае страшнае…

15 чэрвеня 1950 года ў Маладэчне адбыўся суд над патрыётамі - пераважна вучнямі 7-10 класаў Смаргонскай і Мядзельскай школ, некаторымі навучэнцамі з Менска. Іх абвінавачвалі не толькі ў *«вражеской пропаганде»*, але і ў зьдзяйсьненні тэрарыстычных актаў. Сьведчанні Расьціслава Лапіцкага на судзе былі прамовамі-абвінавачаннямі рэжыму. Ён гаварыў, як бальшавікі выгналі яго сям'ю зімою з хаты, як яны зьневажаюць за веру ў Бога, закрываюць цэрквы й касьцёлы, як прыніжаюць беларускую мову, як душаць людзей непамернымі падаткамі, даводзячы да самагубства.

Большыня падпольшчыкаў атрымала па 25 гадоў. Лапіцкага ж і Несцяровіча як кіраўнікоў арганізацыі прысудзілі да пакарання сьмерцю. Расьціслаў адмовіўся прасіць памілавання. Ён з абурэннем заявіў: ***“Рабіце сваю чорную справу, мне вашае ласкі ня трэба - можаце мяне забіваць. А я, колькі жыць буду, столькі буду вас усіх ненавідзець і буду вам шкодзіць праз увесь час!”***

У памяці колішніх мядзельскіх і кабыльніцкіх школьнікаў, жыхароў абодвух мястэчкаў і навакольных вёсак Расьціслаў Лапіцкі застаўся як надзвычайная асоба, надзеленая многімі талентамі, са шчырай і добрай душой, адкрытай на чужы боль. Ён выдатна маляваў, добра сьпяваў і граў на розных музычных інструмэнтах. Меў здольнасьці да майстраваньня й вынаходніцтваў - рабіў радыёпрыймачы, езьдзіў на самаробных роварах, у тым ліку й з маторам.

Суд над Расьціславам і большасьцю ўдзельнікаў падполля адбыўся ў Маладэчне ў ліпені 1950-га. Кіраўнік арганізацыі трымаўся мужна й нязломна, браў усю віну на сябе. Ваенны трыбунал прыгаварыў Расьціслава Лапіцкага да расстрэлу. Беларускі патрыёт мужна ўспрыняў такі прысуд і з абурэннем адмовіўся ад прапановы прасіць памілавання.



# Расьціслаў Лапіцкі

*80-я ўгодкі*



*(01.09.1928 - 28.10.1950)*

Ураджэнец в. Касута на Вялейшчыне. Арганізатар і кіраўнік антыбальшавіцкага падпольнага вучнёўскага руху на Мядзельшчыне й Смаргоншчыне ў 1948-1950 (Мядзельска-Смаргонскае моладзевае антыкамуністычнае падполле). Расстраляны ва ўрочышчы Красны Беражок пад Вялейкай.